*С.А. Паўлава,*
*прафесар кафедры менеджменту*
*інфармацыйна-дакументнай сферы*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў,*
*кандыдат філалагічных навук*

# ПСІХАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ЧЫТАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чытанне з’яўляецца адзінай інтэлектуальнай тэхналогіяй засваення накопленых чалавецтвам ведаў у самым шырокім сэнсе гэтага паняцця [2, с.10]. Але чытач – суб’ект не толькі сацыяльны. Уздзеянне кнігі на чытача праз чытацкую дзейнасць не толькі вызначаецца сацыяльнымі фактарамі, але ў большай ступені залежыць ад псіхафізіялагічнага стану рэцыпіента. І калі пытанне аб узаемадзеянні кнігі і чытача на фізіялагічным узроўні яшчэ толькі распрацоўваецца ў межах бібліятэрапіі, то пытанні аб псіхалогіі кнігі і аб псіхалогіі ўздзеяння яе на чытача на сённяшні дзень ужо мае некалькі школ і кірункаў. Вядучае месца ў распрацоўцы праблем псіхалогіі чытання належыць М. А. Рубакіну – заснавальніку бібліялагічнай псіхалогіі.

Стварэнне тэорыі чытацкай дзейнасці – вынік амаль паўвекавога вывучэння чытача і кнігі, заснаванага на аналізе ўздзеяння соцен тысяч кніг на сотні тысяч чытачоў. Асноўныя яе палажэнні М. А. Рубакін сфармуляваў у працы «Психология читателя и книги. Краткое введение в библиологическую психологию» (1929).

Сам аўтар вызначае сваю тэорыю як навуку аб «сацыяльным псіхалагічным уздзеянні» [3, с.16]. Ён уключае ў яе шырокае кола праблем, звязаных з кнігай і чытаннем – набор, друк, выданне, бібліятэка, кніжны гандаль і інш., маючы на ўвазе стварэнне псіхалогіі кніжнай справы і ўсіх яе галін у іх ўзаемным уплыве і функцыянальнай залежнасці.

Сцвярджаючы матэрыялістычную сутнасць сваёй тэорыі, М. А. Рубакін абгрунтоўвае яе біялагічныя карані. У гэтай тэорыі ён абапіраецца на вучэнне І. П. Паўлава. М. А. Рубакін падкрэслівае, што творчыя сілы арганізма асноўваюцца на рэфлексе. У кніжнай справе вядучую ролю адыгрываюць так званыя ўмоўныя рэфлексы. Чытанне, слуханне, разуменне, мысленне, па Рубакіну, розныя формы ўмоўных рэфлексаў, гэта значыць рэфлексаў, выпрацаваных шляхам паўтарэння адных і тых

жа дзеянняў, звычак. Слова ён разглядае не як перадатчык або сігнал, які мае пэўнае абагульняючае значэнне, а як крыніцу рэфлексаў, як раздражняльнік, узбуджальнік псіхічнай дзейнасці. Апошнюю ён трактуе ў русле даследаванняў Вільгельма Гумбальта і Аляксандра Пацебні як дзейнасць бяскрайнюю, якая не мае межаў разумення. Канкрэтна ў М. А. Рубакіна гэта значыць: што б ні ўкладаў пісьменнік у свае творы або прамоўца ў свае выступленні, іх змест не дойдзе да чытача, слухача. Каб яны дайшлі па адрасе, чытач і слухач павінны самі гэты змест стварыць.

Чытач і слухач бачаць перад сабою толькі сваю ўласную праекцыю чужога тэксту або мовы. Для тлумачэння таго, як гэта адбываецца ў кожнага чалавека, гэта значыць для тлумачэння індывідуальных асаблівасцей успрымання, М. А. Рубакін прыцягвае тэорыю клетачнай памяці нямецкага псіхолага Р. Сэмана, згодна якой у мозгу чалавека адбываецца накапленне адбіткаў папярэдніх уздзеянняў, запас якіх складае так званую *мнему*. Гэты тэрмін Р. Сэман прапануе замест тэрміна *памяць*. Аднаўленне зместу кнігі або мовы адбываецца ў індывіда з элементаў яго ўласных мнем, гэта значыць сукупнасць думак, пачуццяў, якія ўзнікаюць у чытача, атаясамліваюцца М. А. Рубакіным са зместам кнігі. Таксама ён падкрэсліваў, што мнемы рухомыя, яны мяняюцца, г.зн. носяць дынамічны характар. Чытанне кнігі экфарыруе ў мнеме вызначаны комплекс энграм. І такім чынам чытач будуе праекцыю кнігі ў залежнасці ад яе колькаснага і якаснага боку, і гэту праекцыю ён прымае за якасць самой кнігі і называе яе зместам чытаемага ім твора [3, с. 59]. Тэорыя М. А. Рубакіна выклікае шмат меркаванняў аб тым, што колькі існуе чытачоў, столькі ёсць і зместаў тэксту. Але сам М. А. Рубакін ніколі гэтага не сцвярджаў. Калі разглядаць змест слова і твора, якія знаходзяцца ў супакоі да моманту чытання, то пры чытанні слова і твор, згодна тэорыі М. А. Рубакіна, становяцца ўзбуджальнікамі псіхалагічнага перажывання ў кожнай індывідуальнай мнеме, што прыводзіць да разумення ўкладзенага аўтарам зместу. Іншымі словамі, не існуе простага працэсу перадачы зместу. Палажэнне М. А. Рубакіна аб індывідуальнай своеасаблівасці ўспрымання на сённяшні час мае агульнае прызнанне, а думка аб уплыве ведаў і жыццёвых уражанняў на ўспрыманне кнігі набывае асаблівае значэнне ў сувязі з развіццём тэорыі інфармацыі.

Такім чынам, тэорыя чытання М. А. Рубакіна, асноўныя палажэнні якой былі абгрунтаваны ў пачатку ХХ ст., на сучасным этапе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

набыла статус самастойнай дысцыпліны «Бібліятэчная псіхалогія», між іншым яе належнасць да пэўнага віду навук яшчэ не вызначана. М. А. Рубакін першы звярнуў увагу на неабходнасць вывучэння ўзаемадзеяння паміж аўтарам, тэкстам і чытачом. Яго формула «аўтар–кніга–чытач» стала базавай для сучасных тэарэтычных абгрунтаванняў чытацкай дзейнасці.

Бібліялагічную псіхалогію адносяць і да кнігазнаўства, і да бібліятэказнаўства, і да педагагічных дысцыплін, і да псіхалогіі.

Асноўнымі пытаннямі, рашэннем якіх займаецца бібліяпсіхалогія, з’яўляюцца – псіхалогія чытання, псіхалогія чытача, тыпалогія чытачоў і шэраг іншых, якія адносяцца да чытача і чытання.

На сучасным этапе можна вылучыць наступныя кірункі ў вывучэнні псіхалогіі чытання [1] – школа А. А. Пацебні, у якой чытацкае ўспрыманне разглядаецца незалежна ад зместу твора; школа Д. Н. Аўсяніка-Кулікоўскага, у якой асноўны акцэнт робіцца на вывучэнні ідэнтыфікацыі чытання і працэсу творчасці; псіхалагічная школа Л. С. Выгоцкага, у якой вывучаюць чыстую псіхалогію мастацтва, даследуюцца толькі форма і матэрыял мастацтва; школа паслядоўнікаў М. А. Рубакіна, дзе праводзіцца вывучэнне праекцыі кнігі ў мысленні чытача, адмаўляючы аб’ектыўны змест.

У псіхалогіі чытыча і чытання вызначаны наступныя кірункі вывучэння – структура чытацкай псіхалогіі; прырода і заканамернасць асноўнага яе праяўлення (патрэбнасць у чытанні, чытацкія інтарэсы і ўстаноўкі, меркаванні, звычкі і інш.); фактары яе фарміравання і выхавання; тыпалогія чытачоў; сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці чытацкіх груп і аўдыторыі.

Адпаведна вызначаны бібліяпсіхалагічныя катэгорыі – чытач, чытацкая дзейнасць, чытацкае разуменне, чытацкія стасункі. У той жа час катэгорыі бібліятэчныя – кніга, кніжны фонд, кола чытання – хаця і не ўваходзяць у склад катэгорый бібліяпсіхалагічных, але таксама з’яўляюцца аб’ектам для вывучэння ў бібліяпсіхалогіі.

Сучасны стан тэорыі бібліяпсіхалогіі дае магчымасць вызначыць два ўзроўні аналізу вывучэння псіхалогіі чытачоў і чытання.

На ўзроўні агульнай псіхалогіі вывучаецца фарміраванне навыкаў чытання, структура і механізм успрымання і разумення літаратуры розных відаў і жанраў, роля і асаблівасці псіхалагічных працэсаў і стану чалавека пры чытанні (увага, мысленне, эмоцыі), іх залежнасць ад аб’ектыўных якасцей друкаваных выданняў і асаблівасцей чытацкай псіхалогіі асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На ўзроўні сацыяльна-псіхалагічным чытанне вывучаецца як звяно камунікацыйнай сістэмы, сродак сацыялізацыі і выхавання асобы.

Асноўны акцэнт у вывучэнні пытанняў кніжнага ўплыву робіцца на неабходнасці вывучэння не кнігі, а чытача, яго душэўных перажыванняў, якія вылучаны ў сем асноўных груп – паняцця і агульныя абстрактныя ўяўленні; вобразы (уяўленні вельмі канкрэтныя, жывыя); адчуванні; так званыя элементы вобраза (напрыклад, колер, густ, пачуцці, эмоцыі, афекты, гэта значыць рух душы, жаданні, імкненні і інш.); ніжэйшыя арганічныя пачуцці; інстынкты (палавыя, бацькоўскія, стадныя); разумовае перажыванне, успамін, якія ўзбуджаны тэкстам.

Працэс чытання ў бібліяпсіхалогіі вывучаецца не з пазіцыі таго, што чытае рэцыпіент, непасрэдна прадметам вывучэння з'яўляецца сам працэс чытання (унутраныя матывы, перажыванні, устаноўкі, настрой, якія ўзнікаюць у працэсе чытання) і ўплыў працэсу чытання на актуальнасць чытання асобы.

Такім чынам, бібліяпсіхалагічная тэорыя чытацкай дзейнасці, робячы акцэнт на перавагу ў працэсе камунікацыі асабовых характарыстык чытача, працягвае развіваць як канцэпцыі філасофскіх кірункаў у вобласці чытацкай дзейнасці, так і канцэпцыі літаратуразнаўства.

Нягледзячы на розніцу ў прыватных пытаннях наконт узаемадзеяння сістэмы «аўтар–тэкст–выдавец–кніга–чытач», можна азначыць асноўныя агульныя палажэнні, якія ўласцівы ўсім канцэпцыям:

– у дадзенай сістэме існуе структурная сувязь усіх элементаў чытацкай дзейнасці, узаемадзеянне паміж якімі вызначаецца перш за ўсё актыўнасцю, накіраванай на авалоданне аб'ектам з боку суб'екта;

– мастацкі твор – двухмерны. Існуе аб'ектыўны вобраз твора, закладзены аўтарам, і ёсць вобраз твора, які ўзнікае ў працэсе чытання. Толькі ў працэсе чытання тэкст аўтара пераходзіць у мастацкі твор;

– двухмернасць мастацкага твора ставіць пытанне аб шматварыянтнасці прачытання самога твора – пры наяўнасці ўстойлівага ядра сэнсу ў працэсе чытання адбываецца сутыкненне аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, закладзеных у самім творы, гэта значыць сэнс твора, закладзены аўтарам, не мяняецца, змяняецца толькі эстэтычна-анталагічны статус мастацкага твора;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сістэма «аўтар–тэкст–выдавец–кніга–чытач» пастаянна знаходзіцца ў працэсе мастацкай камунікацыі, якая ўключае ў сябе два ўзаемаабумоўленыя працэсы – стварэння мастацкага твора і яго ўспрымання.


1. *Воробьева, К. И.* Отечественная библиологическая психология : история, теория, современное состояние : дис. … д-ра психол. наук / К. И. Воробьева. – Хабаровск, 1996. – 400 л.

2. *Мелентьева, Ю. П.* Феномен чтения поиски сущности / Ю. П. Мелентьева // Чтение как стратегия жизни: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Москва, 14 дек. 2006 г. / ред. Б. В. Ленский. – М. : Наука, 2006. – С. 7–13.

3. *Рубакин, Н. А.* Психология читателя и книги. Краткое введение в библиологическую психологию / Н. А. Рубакин. – М. : Книга, 1977. – 175 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ